ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама

А.Л.Вярсоцкі
2018 г.

# ІНСТРУКЦЫЯ
аб парадку арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу танцавальных калектываў “СКОКІ ВА ЎСЕ БОКІ”

Дадзеная інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення абласнога конкурсу танцавальных калектываў “Скокі ва ўсе бокі” (далей – Конкурс) , які адбудзецца 21 красавіка 2018 г. у г.Смаргонь.

1. Мэтамі і задачамі Конкурсу з’яўляецца: вывучэнне, аднаўленне і захаванне мясцовай (рэгіянальнай) традыцыйнай танцавальнай культуры, развіццё і прапаганда беларускага харэаграфічнага мастацтва, стымуляванне і актывізацыя дзейнасці танцавальных калектываў розных напрамкаў, узаемаўзбагачэнне рэпертуару лепшымі ўзорамі беларускай танцавальнай спадчыны, сучаснай харэаграфіі, арганізацыя вольнага часу і развіццё творчых здольнасцей дзяцей і моладзі, выяўленне калектываў з мэтай рэкамендацыі для прысваення наймення “народны” (“узорны”).
2. Арганізатары Конкурсу – галоўнае упраўленне ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Гродзенскага аблвыканкама, ДУК “Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці”, аддзел ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Смаргонскага райвыканкама.
3. Конкурс праводзіцца 1 раз у 2 гады.
4. Конкурс праводзіцца ў два туры: 1 тур - раённыя агляды аматарскага харэаграфічнага мастацтва, 2 тур – абласны (заключны) этап Конкурсу ў г. Смаргонь.
5. У Конкурсе прымаюць удзел харэаргафічныя аматарскія калектывы, не залежна ад іх адміністрацыйнай прыналежнасці, якія не маюць наймення, і калектывы з найменнем “народны” (“узорны”), “Заслужаны”, у дзвюх узроставых катэгорыях: дзіцячая (да 14 гадоў), маладзёжная (ад 15 гадоў і болей).
6. Кожны калектыў прадстаўляе адзін харэаграфічны нумар, раней не прадстаўлены на Конкурс, які вылучаецца арыгінальнасцю, самабытнасцю, высокім выканальніцкім майстэрствам, якасцю музычнага суправаджэння.

7. Агульная заяўка да ўдзелу ў Конкурсе зацвярджаецца начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі рай(гар)выканкама і дасылаецца ў аргкамітэт Конкурсу.

8. Журы Конкурсу ацэньвае асобна калектывы, якія не маюць наймення, і калектывы з найменнем "народны" ("узорны"), па наступных намінацыях: беларускі, народны танец; сучасны, эстрадны танец (усе віды), у дзвюх узроставых катэгорыях: дзіцячая (да 14 гадоў), маладзёжная (ад 15 гадоў і болей).

9. Пры адсутнасці ўдзельнікаў у катэгорыі ці намінацыі журы мае права: аб'ядноўваць намінацыі; не прысвойваць месцы; падзяляць II і III месцы, а таксама ўводзіць новыя намінацыі ў рамках выдзеленага прызавога фонду.

10. Журы мае права ўзнагароджваць калектывы спецыяльнымі дыпломамі і прызамі: за арыгінальны сцэнічны касцюм; за лепшае рэжысёрскае вырашэнне нумару; за пераемнасць народных традыцый і ўвасабленне нацыянальнага каларыту; за лепшую інструментальную ці аркестравую групу суправаджэння; за лепшы балетмайстарскі нумар; за самага маладога ўдзельніка, альбо паспяховы дэбют.

11. Па выніках 2 тура Конкурсу лепшым калектывам прысвойваюцца званні лаўрэата (I, II, III ступені), уручаюцца дыпломы і прызы (24 адзінкі), спецыяльныя дыпломы і прызы (6 адзінак). Астатнія калектывы атрымліваюць дыпломы за ўдзел. Рашэнне журы з'яўляецца канчатковым і перагляду не падлягае.

12. Фінансаванне правядзення заключных мерапрыемстваў Конкурсу у г.Смаргонь ажыццяўляецца за кошт сродкаў абласнога бюджэту, прадугледжаных у каштарысе ДУК "Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці" на цэнтралізаваныя мератрыемствы. За кошт бюджэтных сродкаў фінансуюцца: выраб эмблемы, набыццё прызоў, спецыяльных прызоў, дыпломаў, заработная плата з налічэннямі: членам журы, вядучым, відэаапаратару.

13. Усе выдаткі па знаходжанні на конкурсе калектываў Гродзенскай вобласці ажыццяўляюцца за кошт накіроўваючых арганізацый.

14. Арганізатары Конкурсу захоўваюць неабмежаваныя правы на запіс і распаўсюджванне выступленняў калектываў рознымі тэхнічнымі сродкамі і спосабамі. За дадзеныя запісы ганарары выканаўцам не выплачваюцца.

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела
ідэалагічнай работы, культуры і па
справах моладзі ___________________
_______________гар(рай)выканкама
_________________________________

# ЗАЯЎКА

на ўдзел у абласным конкурсе танцавальных калектываў
"Скокі ва ўсе бокі" 21 красавіка 2018г.

1.Раён(горад)_______________________________
2.Намінацыя________________________________
3. Узроставая катэгорыя (дзіцячая, маладзёжная)______________
4. Поўная назва калектыву___________________________
_____________________________________________
5. База дзейнасці калектыву_________________________
_____________________________________________
6. Назва і працягласць нумару_______________________
7. Прозвішча, імя, імя па бацьку кіраўніка калектыву______________
_____________________________________________
8. Пашпартныя дадзеныя кіраўніка калектыву_________________
_____________________________________________
9. Тэлефоны: _______________ (службовы); ______________ (мабільны)
10. Колькасць удзельнікаў ____________________________
11. Наяўнасць фанаграмы (CD / DVD) ці інструментальнай (аркестравай) групы________________________________
12. Тэхнічнае забеспячэнне (пры наяўнасці інструментальнай групы)
_____________________________________________
13. Творчая характарыстыка___________________________
_____________________________________________
_____________________________________________
_____________________________________________
_____________________________________________
_____________________________________________

Кіраўнік базавай установы ___________________

Заяўкі (форма дадаецца) дасылаюцца ў аргкамітэт да: 01 красавіка 2018 г. на адрас: ДУК "Гродзенскі АМЦНТ", вул.Савецкая,8 г..Гродна. 230023

Кантактныя тэлефоны: 8 (0152) 743610; т./факс: 8 (0152) 722704.E-mail: onmct@tut.by

Агульная заяўка для ўдзелу ў Конкурсе зацвярджаецца начальнікам аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі рай(гар)выканкама.

СенчаН.Г 74-36-10